**Міжнароднае спаборніцтва па еўрапейскім праве**

# THE EUROPEAN LAW MOOT COURT COMPETITION

Студэнты 3-5 курсаў, магістранты і аспіранты Беларускага дзяржаўнага ўніверсітэта запрашаюцца да адбору ў каманду для ўдзелу ў буйнейшым міжнародным спаборніцтве па еўрапейскім праве The European Law Moot Court Competition (ELMC).

Тэрміны правядзення сёлетняга спаборніцтва: адбор удзельнікаў у каманду – да 27 верасня, рэгістрацыя ўдзельнікаў – да 25 лістапада, пісьмовая частка – да 30 лістапада, вынікі пісьмовай часткі – студзень 2012 г., рэгіянальныя фіналы – люты 2012 г., фінал – сакавік-красавік 2012 г. З больш падрабязнай інфармацыяй і правіламі спаборніцтва можна азнаёміцца на сайце www.elmc.org.

Патрабаванні да кандыдатаў:

- Вольнае валоданне пісьмовай і вуснай англійскай мовай і юрыдычнай тэрміналогіяй. Валоданне французскай мовай будзе разглядацца ў якасці перавагі;
- Адсутнасць удзелу ў вусных этапах спаборніцтва папярэдніх гадоў;
- Імкненне да асабістага і прафесійнага развіцця, здольнасць працаваць ў камандзе і індывідуальна, устойлівасць да стрэсаў і валоданне здольнасцямі time management.

Падрыхтоўку каманды будуць ажыццяўляць былыя ўдзельнікі падобных спаборніцтваў і выкладчыкі БДУ.

Для ўдзелу ў адборы неабходна падрыхтаваць пісьмовы адказ на пытанне 1 абзаца 23 сёлетняй версіі справы, якая знаходзіцца на сайце спаборніцтва. Адказ дасылаецца ў фарматах .doc, .docx, .rtf ці .odt (назва файла складаецца з прозвішча і імя кандыдата, да прыкладу KolasJakub.doc) на электронную скрыню elmc2011.2012@gmail.com **да 12-00 24.09.2011**. Пасля разгляду дасланых адказаў адбудзецца сустрэча з асобнымі кандыдатамі ў каманду.

Усе пытанні, якія тычацца падрыхтоўкі і ўдзелу, просім адрасаваць на вызначаную вышэй электронную пошту.